МГА «Экапартнёрства»

Ганна Янкута

# ВАМ ДАПАМОЖА КВА



Мінск
«Альтиора Форте»
2022

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
Я49



Выданне падрыхтавана і выдадзена ў межах праекта «Удзел грамадства і эфектыўнае кіраванне воднымі рэсурсамі ў Мастоўскім раёне» пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза.

Змест публікацыі з'яўляецца прадметам адказнасці МГА «Экапартнёрства» і не можа разглядацца ў якасці пункту гледжання Еўрапейскага саюза.

Фінансаванне
Еўрапейскага саюза

Мастоўскі
райвыканкам

ЭКА ПАРТНЁРСТВА

ISBN 978-985-7239-63-4

© Янкута Г. В., 2022
© МГА «Экапартнёрства», 2022
© Афармленне. ТАА «Альтиора Форте», 2022



З самай раніцы ў дамку ля Нёмана не сціхаў тэлефон. Першы раз ён зазваніў у 8:57, за тры хвіліны да пачатку працоўнага дня. Квакша, якая толькі зайшла ў кабінет і яшчэ не ўключыла камп'ютар, схапіла трубку:

– КВА слухае, добры дзень!

КВА – гэта Казачнае воднае агенцтва. Яно сочыць, каб у Мастоўскім раёне ва ўсіх была чыстая вада. Балотніца Квакша працуе там шмат гадоў, і многія думаюць, што агенцтва названае ў гонар яе. Але насамрэч гэта супадзенне, якім Квакша вельмі ганарыцца.

– Вы хвалюецеся, што вада ў вашым калодзежы шкодная для здароўя? Мы абавязкова праверым!

За суседнім сталом засяроджана клацаў па клавіятуры рачны дух Баламут. Баламут – гідраінжынер, гэта значыць спецыяліст, які працуе з вадой. Пра ваду ён ведае ўсё, бо скончыў прэстыжную Нарачанскую акадэмію. Але не звяртайце ўвагі на яго сур'ёзны выгляд. Насамрэч Баламут – жартаўнік і часам любіць пасваволіць.

Квакша паклала трубку, і тэлефон зноў зазваніў.

– Так я нічога не паспею! – прастагнала балотніца.

– Давай тады я выкіну твой тэлефон у акно, – прапанаваў Баламут.

Квакша хмыкнула і ўзяла трубку.

– КВА слухае, добры дзень!



Тут у кабінет зайшла Расíца.

– Усім прывітанне!

Расіца – русалка, якая жыве ў Нёмане і таксама працуе ў КВА. Яна – найлепшая знаўца воднай хіміі ад Дзвіны да Прыпяці. У Мастоўскім раёне яе за гэта вельмі паважаюць. Часам па раніцах яна ездзіць правяраць ваду ў школах і тады з'яўляецца ў дамку ля Нёмана пазней за астатніх.




– Ёсць на сёння нешта тэрміновае? – спытала русалка.

Квакша, якая якраз скончыла гаварыць па тэлефоне, адказала:

– Клаўдзія Арэхаўна з-пад Мастоў баіцца, што ў яе калодзежы вада кепскай якасці. Трэба з'ездзіць праверыць.



– Ужо лячу! – усклікнула Расіца. – Толькі вазьму ў лабараторыі парачку тэстаў.





Расіца пад'ехала да дома Клаўдзіі Арэхаўны, прыхінула ровар да агароджы і зайшла ў двор. На арэлях ля ганка сядзелі бабуля з унучкай.

– Добры дзень! – павіталася русалка. – Мяне завуць Расіца, і я з КВА. Буду правяраць ваш калодзеж.

– Як добра, што вы прыйшлі, – заўсміхалася Клаўдзія Арэхаўна. – А я тут тлумачу ўнучцы, што трэба сачыць за якасцю вады, якую мы п'ём.  Ад гэтага залежыць наша здароўе.

Яна злезла з арэляў і падвяла Расіцу да калодзежа.

– У інтэрнэце пішуць, што нават празрыстая вада можа быць шкоднай.

Русалка выцягнула з калодзежа поўнае вядро і наліла адтуль у прабірку з тэставай палоскай. Праз хвіліну на палосцы праступіў фіялетавы квадрацік. Клаўдзія Арэхаўна вохнула, а Расіца нахмурылася:

– Бачыце? Гэта значыць, што ў вадзе шмат нітратаў і піць яе не варта. Яна небяспечная для здароўя.





– Адкуль у калодзежы нітраты? – не зразумела Клаўдзія Арэхаўна.

– Думаю, адтуль, – адказала Расіца і паказала на поле, якое пачыналася за ўчасткам. – Зямлю ўгнойваюць, каб атрымаць лепшы ўраджай, і рэшткі ўгнаенняў трапляюць у ваду.

– І што цяпер рабіць? – засмуцілася гаспадыня.

– Піць салодкую газіроўку! – прапанавала яе ўнучка. – У ёй нітратаў няма.

Русалка пакачала галавой.

– Але газіроўка таксама зусім не карысная. Ды і супу на ёй не зварыш, – тут яна павярнулася да Клаўдзіі Арэхаўны. – Мы падумаем, як вам дапамагчы. А пакуль бярыце ваду ў суседзяў. Тых, што жывуць далей ад поля. Мы нядаўна рабілі замеры – у іх глыбокая свідравіна, і вада адтуль вельмі добрая.

Гаспадыня пачырванела.

– Яны ж тут нядаўна. Мы нават не знаёмыя...



– Зараз я пакажу, як трэба знаёміцца! – усклікнула ўнучка і пабегла да плота.

У суседні двор выйшла маладая жанчына.

– Добры дзень! – пракрычала ёй дзяўчынка і памахала рукой. – А давайце сябраваць!

– Давайце, – усміхнулася жанчына. – Заходзьце да нас на пірог з рэвенем.

– А можна мы яшчэ вады ў вас набяром? У нашым калодзежы яна шкодная для здароўя.

– Ну вядома, – адказала жанчына.

– Бачыш, як проста? – паглядзела ўнучка на бабулю. – А зараз мы ідзём у госці.

– Нашай вадой хаця б мыцца можна? – спытала ў русалкі ўсё яшчэ збянтэжаная Клаўдзія Арэхаўна.

– Можна, – кіўнула тая. – І мыцца, і мыць посуд, і праць бялізну, і нават паліваць агарод. Хаця для агарода лепш паставіць бочку – збіраць у яе дажджавую ваду.







У Баламута спраў таксама хапала. Летась рачны дух спраектаваў сістэму ачысткі вады для сям'і Ерчыкаў, і прыйшоў час праверыць, ці добра ўсё працуе. Так што цяпер ён сеў у лодку, пляснуў далонню па вадзе – і лодка сама, без вёслаў, паплыла супраць цячэння! Рачныя духі так умеюць.

Нёман хутка данёс Баламута да вёскі, дзе жылі Ерчыкі. Ён прывязаў лодку да вярбы і рушыў да знаёмага дома. Убачыўшы госця, дзеці, што гулялі на падворку, падбеглі да брамы.

– Вы да нас? – пацікавілася старэйшая Соня.

Баламут кіўнуў.

– Хачу праверыць, як працуе вадасцёк.

– А давайце я пакажу вам нашы джунглі! – пракрычаў Капітан Аўстралія.

Насамрэч яго звалі Пётрык, але паколькі ён марыў даплысці да Аўстраліі, Соня прыдумала яму такую мянушку. Цяпер Капітан Аўстралія трымаў у руцэ караблік, які яны з татам змайстравалі з сасновай кары.

Соня пагладзіла брата па галаве.

– Гэта сур'ёзная справа. Зараз я паклічу маму.






Калі мама выйшла з дома, яны з Баламутам адправіліся правяраць вадасцёк. Дзеці ўвязаліся за імі.

– Трубы – у парадку, бочкі-септыкі – таксама, – сказаў Баламут, калі яны агледзелі зарослы чаротам і жоўтымі касачамі ўчастак.

– Бочкі – гэта нецікава, – буркнуў Капітан Аўстралія. – Каму яны патрэбныя?

– У горадзе ў дамах ёсць цэнтральная каналізацыя, – пачаў тлумачыць Баламут. – Калі хтосьці выкупаўся ці памыў рукі, вада па трубах цячэ на ачышчальную станцыю, а адтуль, ужо чыстая і празрыстая, зліваецца ў раку.

– Але ў вёсцы ўсё не так проста... – задуменна сказала Соня.

– У вёсцы такой каналізацыі няма. І з вадой, якую вы выкарысталі, трэба нешта рабіць. Інакш у вас пад вокнамі ўтворыцца вялізнае смярдзючае возера, якое забрудзіць усё навокал.

Капітан Аўстралія хіхікнуў.



– Таму вада, у якой ты памыўся сам ці памыў посуд, – працягнуў Баламут, – спачатку адстойваецца ў бочках-септыках, а пасля цячэ сюды, – тут ён паказаў на зараснік чароту і касачоў.

– У нашы джунглі!? – не паверыў Капітан Аўстралія.

Баламут кіўнуў:

– Тут яна ідзе праз слой грунту, які складаецца са шчэбню і пяску. Таму па-навуковаму гэтыя джунглі называюцца грунтава-расліннай пляцоўкай. Праходзячы праз яе, вада ачышчаецца ад бруду і сцякае ў сажалку, дзе паступова выпараецца.

– І не смярдзіць, – дадала Соня.

Капітан Аўстралія прынюхаўся.

– А я думаў, расліны тут для прыгажосці.

– Касачы і чарот патрэбныя для лепшай ачысткі вады, – сказаў рачны дух. – Але і для прыгажосці таксама.








– А зараз мы пойдзем запускаць караблік! – усклікнуў Капітан Аўстралія.

Баламут у гэты момант набіраў у прабірку вады з трубы, што выходзіла ў сажалку.

– У мяне сёння шмат працы, – запярэчыў ён.

– Ну, калі ла-а-а-аска, пяць хвілін! – упрошвалі яго дзеці.

– Што з вамі зробіш, – уздыхнуў рачны дух, хаця насамрэч яму было прыемна. – Але толькі пяць хвілін!

Яны выйшлі за браму і адправіліся да Нёмана.



На беразе Баламут апусціў караблік у ваду, плюхнуў па ёй далонню – і караблік паплыў супраць цячэння! Рачныя духі так умеюць. Хлопчык запляскаў у ладкі.

– А ён дабярэцца да Аўстраліі? – з надзеяй спытаў ён.

Баламут наморшчыў лоб, на хвілінку задумаўся, а пасля зноў плюхнуў па вадзе – і караблік паплыў у адваротны бок.

– Цяпер шанцаў больш, – сказаў рачны дух. – Калі толькі яго па дарозе не праглыне кашалот.

Соня пырснула ад смеху:

– Добра, што караблік не пластыкавы. Бо тады ў кашалота забалеў бы жывот.





Баламут адвязаў лодку і адплыў ад берага. Капітан Аўстралія памахаў яму рукой.

– Калі я вырасту, то зраблюся рачным духам.

– А я буду сачыць, каб ніхто не кідаў у Нёман пластыкавае смецце, – задуменна сказала Соня.





– Ну, як вынікі? – спытаў Баламут, калі Расіца выйшла з лабараторыі.

Русалка падала яму аркушы з лічбамі і адказала:

– Сістэма ачысткі вады ў Ерчыкаў працуе выдатна: грунт і расліны робяць сваю справу. Можна не хвалявацца, што ў Нёман трапяць брудныя сцёкі.

Баламут схапіў у яе паперы з вынікамі і радасна заскакаў з імі па кабінеце.

– Разлічы, калі ласка, глыбіню новай свідравіны для Клаўдзіі Арэхаўны, – усміхнуўшыся з-пад акуляраў, сказала рачному духу Квакша. – Думаю, гэта будзе найлепшым рашэннем.

– Ужо разлічваю! – усклікнуў Баламут і кінуўся да камп'ютара. – Таму што чыстая вада мусіць быць ва ўсіх!

Літаратурна-мастацкае выданне

**Янкута Ганна Валер'еўна**

# Вам дапаможа КВА

Адказная за выпуск: Аліна Бушмовіч
Мастак-ілюстратар: Лілія Давыдоўская

Выдадзена па замове МГА «Экапартнёрства»
www.ecopartnerstvo.by

Падпісана да друка: 28.12.21. Фармат 60x90 1/8. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 1,6. Ул.-выд. арк. 1,6.
Тыраж 1000 экз. Заказ 2712.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: ТАА «Альтиора Форте».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, рапаўсюджвальніка
друкаваных выданняў №1/506 ад 14.10.2016, №2/172 ад 18.12.2014.

Вул. Сурганава, 11, 86, 220072, г. Мінск
Тэл./факс: + 375 17 294 90 94

